Склаў юбілейны зб. К. «Вершы і паэмы» (1982).

**БЕЮКАГА́** Г. (сапр. Гасымзадэ Беюкага Мамед аглы; 1916—1957), азербайджанскі паэт, перакладчык. Пераклаў вершы К. «Настане такая часіна», «На нашым полі», «Паклон мой народу за песні» («Азербайджан», 1957, №7), «Я не для вас...», урывак з паэмы «Курган» (тамсама, 1962, №5).

**БІБІ́ЛА** Юлія Іосіфаўна (1897—1974), беларускі бібліёграф. У 1922—37 загадчык бел. аддзела Дзярж. б-кі БССР імя Леніна. З 1921 была знаёма з К. У 1920-я г. К. першы з бел. пісьменнікаў перадаў праз яе свае рукапісы на зберажэнне ў Дзярж. б-ку БССР. Складальнік бібліяграфічнай картатэкі твораў К. дарэв. і сав. (даваен.) часу (зберагаецца ў аддзеле бел. л-ры і бібліяграфіі Нац. б-кі Беларусі). Паэт памагаў у складанні картатэкі і ў раскрыцці сваіх псеўданімаў, якімі падпісваўся ў газ. «Наша ніва» і інш. дарэв. выданнях. Ва ўспамінах «Дзяржаўная бібліятэка. 20-я — 30-я гады. Беларускі аддзел» (рукапіс у Нац. б-цы Беларусі) пісала пра К.: «Ён быў жаданым госцем, з ахвотаю дзяліўся сваімі ведамі пра кнігі па вывучэнню Беларусі, пра аўтараў беларускіх выданняў». Запіска К. да Б. з Масквы ў Саратаў ад 10.4.1941 захоўваецца ў ЛМЯнК (ф. 1, воп. 2, адз. зах. 22). Разам з Я.Тулейкам выткала ўзоры бел. арнаментаў на паясах, якія перадала ў ЛМЯнК у 1974. Вышыла гладдзю партрэт К. (захоўваецца тамсама), па эскізе Я.Раманоўскага — партрэт жонкі паэта [з 1965 у філіяле ЛМЯнК у Ляўках (Аршанскі р-н Віцебскай вобл.)]. Успаміны пра паэта ў кн. «Успаміны пра Янку Купалу» (1982).

**БІБЛІЯГРА́ФІЯ ТВО́РАЎ ЯНКІ КУПА́ЛЫ**. Прыводзяцца звесткі пра творы і пераклады К., апубл. асобнымі выданнямі на тэр. Беларусі. Храналагічны перыяд — 1908—2017. За аснову пакладзены храналагічны і храналагічна-алфавітны прынцыпы ўкладання інфармацыі.

### Поўныя зборы

Поўны зб. тв.: у 9 т. Мінск, 1995—2003. Т. 1. Вершы. Пераклады 1904—1907. Мінск, 1995 (У агульнай частцы 1-га тома ў падзагалоўку зроблена памылка: у 10 т.). Т. 2. Вершы. Пераклады 1908—1910. Мінск, 1996. Т. 3. Вершы. Пераклады (1911—1914). Мінск, 1997. Т. 3. Вершы. Пераклады 1911—1914. Мінск, 1997. Т. 4. Вершы. Пераклады 1915—1929. Мінск, 1997. Т. 5. Вершы. Пераклады [з укр., рус., польск.] 1930—1942. Мінск, 1998. Т. 6. Паэмы. Пераклады. Мінск, 1999. Т. 7. Драматычныя паэмы. П'есы. Мінск, 2001. Т. 8. Артыкулы, нататкі, выступленні. Калектыўныя творы. Мінск, 2002. Т. 9, кн. 1. Пераклады. Эпісталярная спадчына. Дарчыя надпісы. «Расейска-беларускі слоўнік». Калектыўнае. Службовыя і асабістыя дакументы. Дадатак. Мінск, 2003. Т. 9, кн. 2. Дапаўненні да папярэдніх тамоў. Летапіс жыцця і творчасці. Дадатак. Мінск, 2003.

### Зборы твораў

Зб. тв.: у 6 т. Мінск, 1925—[1932]. Т. 1. Жалейка. Гусляр. Мінск, 1925. Т. 2. Шляхам жыцця. Мінск, 1926. Т. 3. Раскіданае гняздо. Тутэйшыя. Паўлінка. Прымакі. Мінск, 1927. Т. 4. Сон на кургане. Адвечная песня. На папасе. Песня аб паходзе Ігара. Галька (пер.). Мінск, 1928. Т. 5. Спадчына. Мінск, 1928. Т. 6. Вершы і пераклады дакастрычніцкага і савецкага перыяду. Мінск, 1932.

Зб. тв.: у 3 т. Мінск, 1928—1932. Т. 1. Жалейка. Гусляр (Вершы). Мінск, 1928; Т. 2. Шляхам жыцця (Вершы). Мінск, 1929. Т. 3. Раскіданае гняздо. Паўлінка. Прымакі. Мінск, 1932 [На вокладцы 1933].

Зб. тв.: у 6 т. Мінск, 1951—1954. Т. 1. Вершы (1904—1907). Мінск, 1951, 1954. Т. 2. Вершы (1908—1910). Мінск, 1952. Т. 3. Вершы (1911—1917). Мінск, 1953. Т. 4. Вершы (1918—1942). Мінск, 1953. Т. 5. Паэмы. Пераклады. Мінск, 1954. Т. 6. Драматычныя творы. Мінск, 1954.

Зб. тв.: у 6 т. Мінск, 1961—1963. Т. 1. Вершы і паэмы (1904—1907). Мінск, 1961. Т. 2. Вершы і паэмы (1908—1910). Мінск, 1961. Т. 3. Вершы і паэмы (1911—1917). Мінск, 1961. Т. 4. Драматычныя творы. Паэмы і п'есы. Мінск, 1962. Т. 5. Вершы і паэмы (1918—1932). Мінск, 1962. Т. 6. Вершы і паэмы (1933—1942). Публіцыстыка. Лісты. Мінск, 1963.

Зб. тв.: у 7 т. Мінск, 1972—1976. Т. 1. Вершы. Пераклады (1904—1907). Мінск, 1972. Т. 2. Вершы. Пераклады (1908—1910). Мінск, 1973. Т. 3. Вершы. Пераклады (1911—1917). Мінск, 1973. Т. 4. Вершы. Пераклады (1918—1942). Мінск, 1974. Т. 5. Паэмы. Пераклады. Мінск, 1974. Т. 6. Драматычныя творы. Паэмы. П'есы. Мінск, 1975. Т. 7. Пераклады п'ес. Публіцыстыка. Пісьмы. Летапіс жыцця і творчасці. Мінск, 1976.

### Выбраныя творы

Выбр. тв. Мінск, 1935 (Школьная серыя).

Выбр. тв.: у 4 т. Мінск, 1935—1940. Т. 1. 1905—1916: Вершы. Мінск, 1935. Т. 2. 1905—1916: Паэмы і апавяданні вершамі. Мінск, 1936. Т. 3. Вершы і паэмы савецкага перыяду. Мінск, 1937. Т. 4 [Пад назвай Збор твораў. Т. 4]. 1905—1912: Вершы. Мінск, 1940.

Выбр. тв. Мінск, 1946.

Выбр. тв. Мінск, 1947.

Выбр. вершы. Мінск, 1948 (Б-ка школьніка).

Выбр. тв. Мінск, 1952.

Выбр. лірыка. Мінск, 1967.

Вершы. Мінск, 1970 (Б-ка бел. паэзіі).

Выбранае. Мінск, 1980.

Выйдзі з сэрцам, як з паходняй!..: Выбранае. Мінск, 1982 (Паэт. б-ка).

Выбр. тв. Мінск, 2002.

Выбранае. Мінск, 2011.

Тутэйшыя: выбр. тв. Мінск, 2015 (Мая бел. кніга).

Мая малітва: выбр. тв. Мінск, 2016 (Мая бел. кніга).

### Асобныя творы

Жалейка: вершы. Пб., 1908.

Адвечная песня: паэма ў 12 праявах. Пб., 1910; 2-е выд. Вільня, 1927.

Huslar: zbornik 12 wiersaŭ. Pb., 1910.

Сон на кургане: у 4 абразах. Пб., 1912 [На вокладцы 1913].

Шляхам жыцця. Пб., 1913; 2-е выд. Вільня, 1923; 3-е выд. Вільня, 1935.

Паўлінка: сцэны з шляхецкага жыцця. Пб., 1913; Мінск, 1918 (Зборнік сцэнічных твораў); 2-е выд. Вільня, 1927.

Раскіданае гняздо: драма ў 5 актах. Вільня, 1919. Спадчына: вершы. Мінск, 1922.

Безназоўнае: зборнік вершаў. Мінск, 1925; 2-е выд. Мінск, 1928.

Апавяданні вершам. Мінск, 1926. Кн. 1, 2.

Магіла льва: паэма. Мінск, 1927.

На Куццю: абразок у 1 акце. Вільня, 1928.

Адцвітанне: вершы. Мінск, 1930 (Маст. слова — масам).

За што: паэмы. Мінск, 1930 (Маст. слова — масам).

Песня-байка: вершы. Мінск, 1930 (Маст. слова — масам).

1918—1928. Творы. Мінск, 1930.

Над ракою Арэсай: паэма. Мінск, 1933; 2-е выд. Мінск, 1934; 3-е выд. Мінск, 1936; 4-е выд. Мінск, 1937 (Школьная серыя); 5-е выд. Мінск, 1940 (Масавая б-ка); 6-е выд. Мінск, 1949; 7-е выд. Мінск, 1953.

Вялікаму Сталіну: Пісьмо народаў Савецкай Беларусі. Мінск, 1936 / У суаўт.

Дванаццаць песень пра нашу непераможную Чырвоную Армію, пра яе творца і натхніцеля Вялікага Сталіна, пра яе палкаводца Клімента Варашылава... Мінск, 1936 / У суаўт.

Песня будаўніцтву: вершы. Мінск, 1936.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пісьмо беларускага народа Вялікаму Сталіну. Мінск, 1936 / У суаўт.
Прымакі: сцэнічны жарт у адным акце. Мінск, 1936.
Беларусі ардэнаноснай: вершы. Мінск, 1937.
Вялікаму Сталіну ад беларускага народа: Пісьмо ў вершах ад паэтаў БССР. Мінск, 1937 / У сааўт.
Паўлінка: камедыя у 2 актах. Мінск, 1937.
Хлопчык і лётчык: вершы. Мінск, 1937.
Радзіме і правадыру: вершы і песні аб Сталінскай канстытуцыі. Мінск, 1938 / У сааўт.
Ад сэрца: вершы. Мінск, 1940.
Дванаццаць песень... Мінск, 1940 / У суаўт.
Для дзяцей: вершы. Мінск, 1940.
Курган: поэмы. Минск, 1940.
Паэмы. Мінск, 1940.
Народ-мститель. М., 1941 (Б-ка красноармейца).
Беларускім партызанам. [Б.м.], 1942.
Творы. М.; Л., 1942.
Узнімайся, народзе мой, на вялікую расплату! Зварот да беларускага народа. [Б.м.], 1942 (выд. Аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б).
Арлянятам: вершы для дзяцей. Мінск, 1945.
Вершы. Мінск, 1947.
Вершы і паэмы. Мінск., 1948.
Славуты домік: вершы. Мінск, 1948 (Першая бібліятэчка школьніка).
Паэмы. Мінск, 1949.
Драматычныя творы. Мінск, 1952.
Песні і думы: вершы аб У.І.Леніне і І.В.Сталіне. Мінск, 1952.
На нашым полі: вершы. Мінск, 1953.
Хлопчык і лётчык; Алеся: вершы. Мінск, 1953.
Паэмы. Мінск, 1957.
Паэмы, драматычныя творы. Мінск, 1957.
Вершы; паэмы. Мінск, 1958.
Мой край: вершы. Мінск, 1958.
Драматычныя творы: Адвечная песня; Сон на кургане; Паўлінка; Раскіданае гняздо. Мінск, 1961.
Курган; Бандароўна; Магіла льва: паэмы. Мінск,1962.
Вершы, паэмы. Мінск, 1966 (Школьная б-ка).
Курган: паэма. Мінск, 1967 / Бел., рус., укр.
Паўлінка; Раскіданае гняздо: п'есы. Мінск, 1967 (Школьная б-ка).
Паўлінка: камедыя ў 2 актах. Мінск, 1969 (Б-ка бел. драматургіі).
Алеся; Хлопчык і лётчык: вершы. Мінск, 1970.
Вершы. Мінск, 1970 (Б-ка бел. паэзіі).
Паэмы. Мінск, 1971 (Школьная б-ка).
Вершы. Мінск, 1972.
Вечарынка: гумар і сатыра. Мінск, 1972.
Курган; Бандароўна; Магіла льва: паэмы. Мінск, 1972.
Публіцыстыка. Мінск, 1972.
Раскіданае гняздо: драма ў 5 актах. Мінск, 1973 (Б-ка бел. драматургіі).
Тарасова доля: паэма. Мінск, 1975 / Бел., рус., укр.
Драматычныя творы. Мінск, 1978 (Школьная б-ка).
Паэмы. Мінск, 1978.
Паэмы. Мінск, 1979 (Школьная б-ка).
Яна і я: паэма. Мінск, 1979.
Адвечная песня: драматычная паэма. Мінск, 1981.
Алеся: вершы. Мінск, 1981 (Мая першая кніга).
Лірыка. Мінск, 1981 (Школьная б-ка).
Вершы. Мінск, 1982.
Вершы і паэмы. Мінск, 1982.
Жалейка. Мінск, 1982. Факс. выд.: Пб., 1908.
Курган: паэма. Мінск, 1987.
Сыны: вершы. Мінск, 1987 (Працу кожную шануй).
Вершы. Мінск, 1988.
Спадчына: вершы і паэмы. Мінск, 1988 (Школьная б-ка).
Арлянятам: вершы. Мінск, 1989.
Паэмы; драматычныя творы. Мінск, 1989.
Хлопчык і лётчык: вершы. Мінск, 1990 (Мая першая кніжка).
Мой край: вершы. Мінск, 1991 (Залаты ключык).
П'есы, пераклады. Мінск, 1992.
Спадчына: вершы. Мінск, 1992. Факс. выд.: Мінск, 1922.
Алеся: вершы. Мінск, 1993.
Жыве Беларусь: вершы, артыкулы. Мінск, 1993.
Зімой у лесе: вершы. Мінск, 1996 (Мая першая кніжка).
Родныя вобразы: вершы, паэмы, апавяданні, казкі. Мінск, 1997 (Школьная б-ка).
Родныя вобразы: вершы, паэмы, апавяданні, казкі. Мінск, 1998.
Вясенняя раніца: вершы. Мінск, 1999.
Явар і каліна: паэзія кахання. Мінск, 2000.
Адвечная песня: вершы і паэмы. Мінск, 2001.
П'есы. Публіцыстыка. Янка Купала пра сябе. Мінск, 2002.
Санеты. Мінск, 2002 / Бел., англ., ісп., ням., польск., рус., укр., франц.
Зніч любові = Znicz miłości: польскамоўныя вершы. Мінск, 2002.
Тутэйшыя: трагічна-смяшлівыя сцэны у 4 дзеях. Мінск, 2004.
З кутка жаданняў: вершы, паэмы, п'есы. Мінск, 2006 (Б-ка школьніка).
Паўлінка: камедыя ў 2 актах. Мінск, 2006.
Тутэйшыя: трагічна-смяшлівыя сцэны ў 4 дзеях, 2006.
Вершы, паэмы, п'есы. Мінск, 2007 (Б-ка Саюза пісьменнікаў Беларусі).
Мая малітва: вершы, паэмы. Мінск, 2007 (Б-ка школьніка).
З кутка жаданняў: вершы, паэмы, п'есы. Мінск, 2009 (Школьная б-ка).
Вершы, паэмы, п'есы. Мінск, 2012 (Б-ка Саюза пісьменнікаў Беларусі).
Роднае слова: вершы, паэмы, п'есы. Мінск, 2012 (Школьная б-ка).
Шляхам жыцця: вершы. Мінск, 2012. Факс. выд.: Пб., 1913.
З кутка жаданняў: вершы, паэмы, п'есы. Мінск, 2013 (Школьная б-ка).
Творы. Мінск, 2015 (Залатая калекцыя бел. л-ры).
Расцвіла непагаслай зарой: вершы, паэмы, п'есы. Мінск, 2016.
Янка Купала. Для тых, якіх люблю: успаміны, эсэ, вершы, паэмы, п'еса. Мінск, 2017.
Кнігі нашага дзяцінства. Янка Купала: вершы. Мінск, 2017 (Ганаруся табой, Беларусь!).

**Пераклады**

Пажарнікі / Пер. з польск. Мінск, 1928.
Панч П. Зямля / Пер. з укр. Мінск, 1928.
Любчанка А. Пастух: апавяданні / Пер. з укр. Мінск, 1929.
Палішчук В. Ленін: паэма / Пер. з укр. Мінск, 1930.
Пушкін А. Медны коннік: Пецярбургская аповесць / Пер. з рус. Мінск, 1937.
Слова аб палку Ігаравым / Пер. з старaж.-рус. Мінск, 1952.
Шаўчэнка Т. Кацярына: паэма / Пер. з укр. Мінск, 1964.
Слова аб палку Ігаравым / Пер. з старaж.-рус. Мінск, 1984.

**Выданні аб жыцці і творчасці Янкі Купалы**

Янка Купала ў літаратурнай крытыцы: зб. артыкулаў. Мінск, 1928.
Бэндэ Л. Янка Купала: крытычны нарыс. Мінск, 1932.
Дзьякаў А. Трыццацігоддзе літаратурнай дзейнасці народнага паэта БССР Янкі Купалы: 1905—1935. Мінск, 1936.
Кучар А. Янка Купала: публіцыст. лекцыя, прачытаная ў Мінску. Мінск, 1948.
Жыдовіч І. Янка Купала — народны паэт БССР. Мінск, 1950 (У дапамогу лектару і дакладчыку).
Пятровіч Н. Дарэвалюцыйныя паэмы Янкі Купалы. Мінск, 1950 (У дапамогу лектару і дакладчыку).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мазалькоў Я. Янка Купала: жыццё і творчасць. Мінск, 1951.
Івашын В. Янка Купала — вялікі народны паэт. Мінск, 1952.
Янка Купала: зборнік матэрыялаў аб жыцці і дзейнасці нар. паэта БССР Янкі Купалы. Мінск, 1952.
Ватацы Н. Янка Купала, 1882—1942: бібліяграфічны даведнік. Мінск, 1953.
Івашын В. Янка Купала: творчасць перыяду рэвалюцыі 1905—1907 гг. Мінск. 1953.
Бібліяграфія твораў Янкі Купалы: у 3 ч. Мінск, 1955—1972. Ч. 1. 1907—1917. Мінск, 1955. Ч. 2. 1917—1942. Мінск, 1957. Ч. 3. 1942—1960. Мінск, 1972.
Янка Купала: зб. матэрыялаў аб жыцці і дзейнасці паэта. Мінск, 1955.
Бандарына З. Ой, рана на Івана…: старонкі маленства Я. Купалы. Мінск, 1956.
Александрович С. Янка Купала — мастер художественного перевода. Минск, 1958.
Жыдовіч І., Кудраўцаў Н. Янка Купала: жыццё і творчасць: альбом. Мінск, 1959.
Палітыка Д. Янка Купала — перакладчык. Мінск, 1959.
Ярош М. Драматургія Янкі Купалы. Мінск, 1959.
Любімы паэт беларускага народа: зб. артыкулаў. Мінск, 1960.
Ленсу А. Станаўленне метаду сацыялістычнага рэалізму ў творчасці Янкі Купалы. Мінск, 1962.
Шарахоўская І. Янка Купала: жыццё і творчасць. Мінск, 1962.
Лазарук М. Янка Купала: семінарый. Мінск, 1963.
Ленсу Е. Фольклорные традиции в дооктябрьском творчестве Янки Купалы. Минск, 1965.
Навуменка І. Янка Купала: духоўны воблік героя. Мінск, 1967; 2-е выд. дап. Мінск, 1980.
Макарэвіч А. Фальклорныя матывы ў драматургіі Янкі Купалы. Мінск, 1969.
Шарахоўскі Я. Пясняр народных дум: нарыс жыцця і дзейнасці Я.Купалы. Мінск, 1970.
Гульман Р. Тэксталогія твораў Янкі Купалы: пытанні вызначэння аўтэнтычнага тэксту. Мінск, 1971.
Ярош М. Янка Купала і беларуская паэзія. Мінск, 1971.
Жыдовіч І. Янка Купала — публіцыст. Мінск, 1972.
Есакоў А. Янка Купала і беларускае мастацтва. Мінск, 1972 (У дапамогу лектару).
Есакоў А. Янка Купала і беларускі тэатр. Мінск, 1972.
Юрэвіч У. Янка Купала — наш сучаснік. Мінск, 1972 (У дапамогу лектару)
Такі ён быў: успаміны пра Янку Купалу. Мінск, 1975.
Пуцявінамі Янкі Купалы: дакументы і матэрыялы. Мінск, 1981.
Рагойша В. Напісана рукой Купалы: архіўныя знаходкі. Мінск, 1981.
Ярош М. Янка Купала и современность. Минск, 1981.
Лужанін М. Сустрэчы. Мінск, 1982.
Майхрович А. Янка Купала и Якуб Колас: вопросы мировоззрения. Минск, 1982.
Содаль У. Пуцявінамі сейбіта. Мінск, 1982.
Успаміны пра Янку Купалу. Мінск, 1982.
Ярош М. В памяти народной. Минск, 1982.
Ярош М. Пясняр роднай зямлі: жыццё і творчасць Я.Купалы. Мінск, 1982; 2-е выд. Мінск, 2003.
Бабкова Л., Вітушка Н., Камінская Л. Янка Купала: да 100-годдзя з дня нараджэння: бібліяграфічны паказальнік. Мінск, 1983.
Гапава В. Перачытваючы «Спадчыну» Янкі Купалы. Мінск, 1983.
Науменко И. Творчество Янки Купалы и Якуба Коласа в контексте славянских литератур. Минск, 1983.
Юрэвіч У. Янка Купала: нарыс жыцця і творчасці. Мінск, 1983.
Янка Купала: энцыклапедычны даведнік. Мінск, 1986.
Ярош М. Янка Купала і Якуб Колас: параўнальны аналіз творчасці. Мінск, 1988.
Багдановіч І. Янка Купала і рамантызм. Мінск, 1989.
Дзяшкевіч М. Ад вытокаў радаводных…: літ.-крытычныя артыкулы, нарысы, успаміны аўтара. Мінск, 1991.
Няхай М. Сустрэчы з Прыдняпроўем (Янка Купала і Якуб Колас на Магілёўшчыне): літ.-краязнаўчае даследаванне. Мінск, 1992.
Праневіч Г. Славянскі рамантызм эпохі нацыянальна-вызваленчых рухаў і вобраз беларускага нацыянальнага адраджэння ў паэзіі Янкі Купалы. Брэст, 1993.
Чыгрын С. Янка Купала і Слонімшчына. Слонім, 1993.
Васючэнка П. Драматургічная спадчына Янкі Купалы: вопыт сучаснага прачытання. Мінск, 1994.
Содаль У. Тут бачу свой край. Мінск, 1994.
Слоўнік мовы Янкі Купалы: у 8 т. Мінск, Гомель, 1997—2012. Т. 1. А—Г. Мінск, 1997. Т. 2. Д—К. Мінск, 1999. Т. 3. Л—П. Мінск, 2001. Т. 4. П—С. Мінск, 2002. Т. 5. С—Я. Мінск, 2003. Т. 6. Анамастыка. Мінск, 2003. Т. 7. А—І (дадатак). Гомель, 2012. Т. 8, кн. 1. К—Р (дадатак). Гомель, 2012. Т. 8, кн. 2. С—Я (дадатак). Гомель, 2012.
Максімовіч В. Паэтычная міфатворчасць Янкі Купалы пачатку XX стагоддзя: вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў філал. факультэтаў. Мінск, 1998.
Свой пачэсны пасад: кн. пра Янку Купалу. Мінск, 1999 (Школьная б-ка).
Лойка А. Як агонь, як вада…: раман-эсэ пра Я.Купалу. Мінск, 2000.
Сянюк Д. Эстэтыка творчасці Янкі Купалы. Мінск, 2000.
Тычко Г. Творчасць Янкі Купалы і традыцыі духоўнай рэгіянальнасці ў польскай літаратуры XIX — пачатку XX стагоддзяў. Мінск, 2001.
Бацькаўшчына : зб. гіст. л-ры : 120-я ўгодкі Я.Купалы і Я.Коласа. Мінск, 2002.
Гніламёдаў У. Янка Купала: жыццё і творчасць. Мінск, 2002; 2-е выд. Мінск, 2012.
Чыркі М. Гасцінцам Купалы: да 120-годдзя з дня нараджэння. Мінск, 2002.
Я тут бачу свой край…: да 120-годдзя з дня нараджэння нар. паэтаў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа. Мінск, 2002.
Янка Купала ў выяўленчым мастацтве, 1882—2002: каталог твораў выяўл. мастацтва Дзярж. літ. музея Я.Купалы: да 120-годдзя з дня нараджэння Я.Купалы. Мінск, 2003.
Ляшчынская В. Слова ў паэзіі Янкі Купалы. Мінск, 2004.
Ляшчынская В. Слоўнік параўнанняў у мове мастацкіх твораў Янкі Купалы. Гомель, 2004.
Ляшчынская В., Шведава З. Слоўнік фразеалагізмаў мовы твораў Янкі Купалы. Гомель, 2007.
Міраслаўіч А. Янка Купала: апавяданне ў малюнках. Мінск, 2007.
Мушынскі М. Тэксталогія твораў Янкі Купалы і Якуба Коласа: зб. артыкулаў. Мінск, 2007.
Творы Я.Купалы і Я.Коласа ў Архіве друку Беларусі: да 125-годдзя з дня нараджэння: бібліяграфічны паказальнік. Мінск, 2007.
Янка Купала, Якуб Колас і Магілёўшчына: бібліяграфічны паказальнік. Магілёў, 2007.
Янка Купала і Якуб Колас і дзяржаўна-культурнае будаўніцтва. Мінск, 2007.
Максімовіч В. Нацыянальны космас класікі: дыялог традыцый і наватарства ў творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа. Мінск, 2008.
Рукапісная спадчына Янкі Купалы: каталог: у 2 ч. Мінск, 2008—2010. Ч. 1 (выйшла без звестак аб нумары часткі). Мінск, 2008. Ч. 2. Мінск, 2010.
Ліпскі У. Янкаў вянок: дзецям пра Янку Купалу. Мінск, 2009.
Цікоцкі М. Урокі моўнага майстэрства: стылістычныя назіранні над

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паэзіяй і мастацкай прозай Янкі Купалы і Якуба Коласа. Мінск, 2009.

Шляхам Купалы — шляхам Коласа. Мінск, 2010.

Купала і Колас, вы нас гадавалі: дакументы і матэрыялы: у 2 кн. Мінск, 2010—2012. Кн. 1. 1909—1939. Мінск, 2010. Кн. 2, ч. 1. 1939—2009. Мінск, 2011. Кн. 2, ч. 2. 1939—2009. Мінск, 2012.

Аўтографы першага народнага паэта Беларусі Янкі Купалы : каталог. Мінск, 2011.

Рагойша В. Мой Трыглаў: кніга пра Янку Купалу, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча. Мінск, 2012.

Семашкевіч Р. Янка Купала і беларускае адраджэнне. Маладзечна, 2012.

Трус М. Янка Купала ў Славакіі. Мінск, 2012.

Тычына М. Янка Купала і Якуб Колас: учора і сёння. Мінск, 2012.

Чыгрын С. Па слядах Купалы і Коласа: літ.-краязнаўчыя артыкулы і вершы. Мінск, 2012.

Янка Купала. «Мне сняцца сны аб Беларусі...»: успаміны, эсэ, артыкулы, дакументы. Мінск, 2012.

Янушкевіч Я. Апостал Палесся: святы Андрэй Баболя ў паэмах Янкі Купалы. Мінск, 2013.

*Ж.Л.Раманава, В.В.Давідовіч.*

**БІБЛІЯТЭКА-ЧЫТАЛЬНЯ ДАНІЛОВІЧА «ВЕДЫ»**, прыватная бібліятэка. Існавала ў 1904—14 і 1919—23 у Вільні. Засн. на сродкі І.І.Немзера і Б.Л.Даніловіча. Апошні ў канцы 1906 выкупіў частку ўласнай б-кі Немзера, пасля гэтага яна стала вядома як Б.-ч. Д. «В.». У 1914 дзейнасць б-кі спынена (Даніловіч мабілізаваны ў армію). Адноўлена ў пач. 1919 у час Літ.-Бел. ССР. Падтрымлівала паліт. лінію выд-ва «Знание», якім кіраваў М.Горкі. Налічвала больш за 15 тысяч кніг. Камплектавалася паліт. л-рай, творамі рус. і замежных класікаў на рус., франц., англ., ням. мовах. Тут былі ўсе зборнікі санкт-пецярбургскага выд-ва «Знание», творы К.Маркса, Ф.Энгельса, У.І.Леніна, Г.Пляханава, А.Бебеля, Ф.Мерынга, П.Лафарга, Р.Люксембург, А.Герцэна, М.Чарнышэўскага, М.Дабралюбава, В.Бялінскага, М.Горкага і інш. Атрымлівала каля 80 рус. і замежных газет і часопісаў на польск., ням., франц. мовах. Да 1907 б-ка мела кніжны склад і памяшканне, дзе вялася выдавецкая работа. Рыхтавала і выдавала сістэматычныя анатаваныя каталогі кніг і артыкулаў, якія былі на складзе б-кі. Шмат памагала правінцыяльным б-кам: захоўвала і нелегальна распаўсюджвала забароненую л-ру, высылала каталогі для азнаямлення і набыцця кніг інш. б-камі, падбірала хатнія, школьныя бібліятэчкі, прымала падпіску на перыёдыку. Памагала арганізоўваць і праводзіць бел. вечарынкі, садзейнічала рабоце бел. выдавецкага т-ва «Наша хата». Абслугоўвала больш за 600 пастаянных чытачоў у год. Датацыі не атрымлівала, таму за карыстанне кнігамі бралася невял. плата. Была вельмі папулярная. Паводле загаду віленскага ахоўнага аддзялення ад 9.7.1904 за дзейнасцю б-кі ўстаноўлены пастаянны нагляд, часта праводзіліся вобыскі з канфіскацыяй маёмасці. Загадам ад 11.4.1907 навучэнцам старэйшых класаў было забаронена наведванне «падазронай рэпутацыі чытальні».

З вер. 1908 да восені 1909 у б-цы працаваў бібліятэкарам на абанеменце К. (адначасова супрацоўнічаў у газ. «Наша ніва»). Ён хутка знаходзіў кантакт з чытачамі, заўсёды быў уважлівы, карэктны, умела падбіраў л-ру, дзяліўся думкамі аб прачытанай кнізе. Работа ў б-цы спрыяла агульнаадукац., ідэйнаму і літ. росту маладога К.

Летам 1923 кніжны фонд б-кі перададзены Віленскай бел. гімназіі, у 1933 — Віленскаму бел. музею. З 1945




*Б.Малкін. Будынак **бібліятэкі-чытальні Даніловіча «Веды»**.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ